век может говорить, что верит в определенные моральные принципы, но окружающие могут… и не верить ему» [1, с. 489 - 490]. Искренне верить самому в «моральные принципы» справедливости – наиболее эффективный способ сделать их привлекательными для других, распространить в обществе. Современные учёные достаточно скептичны: «В целом человечество, возможно, когда-нибудь и перерастет религию…, поскольку ее объяснительную роль теперь лучше выполняет наука. Но… прежде, чем это произойдет, нам… придется лучше разобраться в социальных функциях, которые исполняла религия на протяжении всей истории… Для большинства… сам факт веры важнее, чем ее содержание» [1, с. 490 - 491]. Задача науки – осмысливать критерии справедливости в новых условиях, религии – распространять их в обществе; их взаимная интеграция – одна из важнейших ценностей евразийской культуры, образец для всего человечества с точки зрения объединения усилий для эффективного преодоления техногенного кризиса современности.

Литература

1.Аарансон, С. Квантовые вычисления со времен Демокрита / С. Аарансон. - М., 2018

***Анцыповіч М.В*. Асэнсаванне рэлігійнай ідэі ў спадчыне Ігната Абдзіраловіча і Уладзіміра Салаўёва**

Ігнат Абдзіраловіч (Ігнат Канчэўскі 1896 – 1923) – беларускі філосаф, публіцыст, паэт, навучаўся ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце, Маскоўскім універсітэце. У філасофскім эсэ «Адвечным шляхам Дасьледзіны беларускага сьветагляду» (Вільня,1921) Ігнат Абдзіраловіч паставіў пытанні, кшталту: у чым гістарычная місія беларускага народа, які яе культурна-нацыянальны тып? Пры прызнанні злітнасці рэлігійнай і нацыянальнай прыналежнасціІ. Абдзіраловіч адначасова выразняе гэтыя два феномены. У пэўным сэнсе рэлігійная прыналежнасць «надбудоўваецца» над этнічнай ідэнтыфікацыяй, так як яна ў большай ступені напоўнена ідэалагічна і светапоглядна. «Толькі па форме, - як сцвярджаў І. Абдзіраловіч, - мы лічыліся каталікамі або праваслаўнымі, грамадзянамі Масквы і Расеі або Польшчы. Направер мы былі благімі сынамі і

царквы і касьцёлу і «ojczyzny»і «отечества». [1, С. 8]. У эпоху этнічнай «мабілізацыі» (пачатак XXст.), беларускіяэліты, сталі шукаць легітымныя формы нацыянальнага адзінства. Узнікае рух па «нацыяналізацыі» праваслаўяі каталіцызма як формы абароны ад руска-праваслаўнай і польска-каталіцкай культурна-этнічнай асіміляцыі беларусаў. Ігнат Абдзіраловіч адзначаў, што «мы шукалі па чужых дарогах і не знайшоўшы, або здрадзілі бацькаўшчыну і ішлі да чужынцаў, або вагаліся паміж варожымі кірункамі [1, С. 9].

Выспяванне рэлігійнай філасофіі Уладзіміра Салаўёва, які ўзгадоўваўся ў праваслаўнай традыцыі, але ва ўзросце 12 гадоў фактычна адыйшоў ад Царквы, адбывалася няпростым шляхам.Прайшоўшы праз цягу дапратэстанства, іконазмагальніцтва, захапленне дэізмам, пантэізмам, пазітывізмам Ул. Салаўёў пачаў вяртацца да праваслаўя праз заходнюю філасофскую традыцыю, што і стварала адбітак на разуменне імпраблемы хрысціянскай веры, «абнавіць» якую сродкамі розума ён спрабаваў у сваёй філасофіі. РазвагіУл.Салаўёва ў пошуках ісціны скіроўваліся ў бок хрысціянства, але не ў старым, дагматычным, сярэдневяковым, а ў абноўленым варыянце.Праект сусветнай тэакратыі Ул. Салаўёва адмысловы для гісторыі філасофскай думкі XIXст. Ён заключаецца ў тым, што ён не адмаўляў ні гістарычную царкву (Л. Талсты), ні Еўропу (Данілеўскі), ні культуру і цывілізацыю (анархісты), ні Расію (скрайнія заходнікі), ні хрысціянства (Ніцшэ).Задача хрысціянства – у разуменні Ул. Салаўёва – аб’яднаць увесь свет у адно жывое цела, ў выключны арганізм богачалавецтва. «Такімі органамі ў арганізме богачалавецтва з’яўляюцца плямёны і народы» [3, с. 31]. Зямное адзінства абмежавана рамкамі ўсяго існуючага; у свеце Божым – адзінства вечнае, абсалютнае і яно прысутнічае ў выглядзе імкнення да ідэальнага ў зямным грахоўным свеце.

Згодна Мікалая Лоскага сцвярджэнне «па-за царквой няма выратавання» ня варта разумець гэтак, быццам усякі чалавек, не належачы фармальна да праваслаўнай царквы асуджаны на вечныя пакуты. Ён падмацоўвае сваю думку словамі Хамякова аб тым, што «мы не маем ані права, ані жадання строга асуджаць усіх, хто знаходзіцца па – за бачнай Царквой, тым больш што такое меркаванне супярэчыла б Боскай міласэрнасці» [2, с. 187].

З разуменнем М. Лоскага аб ролі і месцы царквы ў гісторыі, перагукваецца думка І. Абдзіраловіча аб тым, што «За даўгія вякі гнёту і зьдзеку над нашай душой мы ўцямілі, што якую скуру сілком не накінь чалавеку, ён застанецца незадаволеным, бо заўсёды ён захоча перш- наперш быць самім сабою, чалавекам, а не замарожаным каталіком або праваслаўным, выгаленым на адзін капыл расейцам, ці паляком, прававерным буржуём, ці камуністым» [1, с. 17]. Гэтым самым удаваднялася немагчымасць спасціжэння гісторыі ў яе суцэльнасці, так як «гісторыя сэнсу не мае», а так як існуюць толькі дакладныя адзінкавыя падзеі, то іх немагчыма аб'яднаць у адзіную паслядоўнасць. Негледзячы на тое, што гісторыя безсэнсоўная, чалавек можа прыдаць ёй сэнс толькі ў абранай ім перспектыве.

Праз тэорыю ўсеадзінства Ул. Салаўёў шукаў такую аснову гістарычнага працэса, «дзе на сцягу Расіі павінна быць напісана не «чалавецтва» і не «народ», а «Богачалавецтва» і «Боганарод», ці, што тое самае, - адзіная і ўсеабдымная царква, усяленскі Дом Прасвятой Багародзіцы" [4, с. 146]. Ул. Салаўёў заклікае адмовіцца ад замарачэнняў, якія ёсць ва ўсіх «карысцеатрымальнікаў», пачынаючы ад шараговага прыхаджаніна, бацюшкі, палітыкаў, платных ідыёлогаў, з прыдуманымі імі сутнасцямі аб душы, Богу, граху, што абкрадваюць жыццё Богачалавецтва.

У пошуках і фармулёўцы рускай ідэі Ул. Салаўёў выразна кіраваўся тым, што рускі народ – гэта народ – баганосец, але ўвасабленнем і праявай гэтага не павінна быць руская праваслаўная царква, царкоўны клір. Як адзначаў Ул. Салаўёў у сваёй працы «Русская идея», «не толькі прызнаецца што рускі народ – народ хрысціянскі, але надзьмута сцвярджаецца, што ён хрысціянскі народ па перавазе і што царква ёсць ісціная аснова нашага нацыянальнага жыцця» [4, с. 48]. Атрымліваецца, што ў выніку неакрэсленасці таго, што ўласна ёсць вышэйшая культура і ў чым яна праяўляецца, няма ні аднаго гістарычнага народа, які не заяўляў бы аб прэтэнзіях на гэтую місію і не лічыў бы свім абавязкам гвалтаваць чужыя народнасці ў імя свайго вышэйшага прызначэння. Згодна Ул. Салаўёва – адзінай нацыянальнай палітыкай для Расіі можа быць толькі хрысціянская, усе прыміральная палітыка.

У супрацьлегласць Уладзіміру Салаўёву, Ігнат Абдзіраловіч адмаўляе не толькі расійскую, ці заходнюю імперскасць, але і лю-

бую канцэпцыю ўсеадзінства на нацыянальнай і рэлігійнай аснове. На яго думку рэлігійныя матывы ўсеадзінства выступаюць толькі ў якасці прыкрыцця для сапраўдных палітычных мэтаў Усходу і Захаду адносна беларускай справы. «Даўгія вякі беларусы стаялі на раздарожжы: адзін шлях кіраваўся на захад, другі на ўсход; так нашыя сьцежкі, пачынаючыся разам, расходзіліся ў розныя, праціўныя бакі» [1, с. 12]. «Ўсход не прызнаваў нас як беларусаў, а вымагаў ад нас прыняцьця свайго усходняга выгляду, які па ўсходняму разуменьню, быў абавязковым. «Славянские ручьи сольются в русском море». Яны ня ўцямлялі, што разам з беларушчынай мы трацім і лепшую частку чалавечнасьці» [1, с. 15]. Адносна Захада ў цэлым і ў прыватнасці Польшчы з яе «od morza do morza», І. Абдзіраловіч сцвярджае: «Захад ідзе з усёй жорсткасьцю Усходу: гвалт, прымус, зьдзек, вырываньне душы беларуса ідзе разам з усімі атрыбутамі прыемнага заходняга твару» [1, с. 17].

З метадалагічнага боку, падыходы І. Абдзіраловіча, і Ул. Салаўёва, выбудоўваюцца вакол аднаго прадмета – быцця духоўна – містычнага, і ініцыятывы перагляду ягонай статуснасці. Ул. Салаўёў спасылаецца на Пагодзіна і Аксакава ў тым, што калі рэлігійная свабода будзе адпушчана ў Расіі, то «палова праваслаўных сялян адпадзе ў раскол, а палова вышэйшага грамадства пяройдзе ў каталіцтва» [4, с. 54]. Фактычна Ул. Салаўёў аналізаваў якія палітычна – рэлігійныя, забабонныя ідэі адстойваюць дзяржаўныя інстытуцыі і наколькі яны трывалыя ў народных масах.

Для І. Абдзіраловіча беларуская ідэя – гэта перад усім адмаўленне скрайніх, месіянскіх форм усходнеславянскага «візантызма» (унітарнасць грамадска-палітычных форм, несцерпнасць поглядаў, канцэтрацыя ўлады у адных руках, абшчыннасць, татальны экспансіянізм) і заходняга індывідуалізма (у ім схавана тэндэнцыя да захопу і асіміляцыі «слабых» і «малых» народаў). Сінтэз лепшых бакоў усходу і захаду, гэтых двух культурнагістарычных тыпаў, на аснове самабытных форм грамадскага жыцця і культуры, на думку І. Абдзіраловіча, вырашыць нашу здольнасць захаваць і ўласны этнаграфічны ўзровень быцця (усходні варыянт) і стварыць адпаведную нацыянальную ўрбаністычную культуру горада (заходні варыянт), сутнасць якіх - бесперапынная творчасць, непрыняццё навечна абазначаных,

аб'ектываваных і дэгуманізаваных ідэй і прынцыпаў грамадска-палітычнага і эканамічнага ладу па падабенству «нацыянальнае – уніфікаванае», «рэлігійнае – атэістычнае».

Літаратура

1.Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветагляду (ЗГУКІ мінуўшчыны). / І. Абдзіраловіч – Мінск, 1993.

2.Лоскі,М. Умовы абсалютнага дабра.У 2- х тамах Т.1. / М. Лоскі - Мінск, 2014.

3.Соловьев, Вл. Национальный вопрс в России. / Вл. Соловьев - М., 2016.

4. Соловьев, Вл. Русская идея. / Вл. Соловьев - С-Петербург, 1991.

***Мушинский Н.И.*** **Парадоксы «нулевого понятия»: преподавание формальной логики в контексте формирования идеологической основы евразийства**

Интеграция образовательного пространства играет важную роль в рамках ЕАЭС, поскольку позволяет осуществлять эффективную подготовку специалистов в разных областях для последующей интенсификации экономического сотрудничества. Преподавание в вузах такой дисциплины, как «Логика (СМ – Философия)» способствует всестороннему формированию идеологической основы евразийства. Некоторые теоретические проблемы учебного курса формальной логики, предположительно, заслуживают внимания в подобном контексте. Например, это касается проблемы наличия «нулевых понятий», порождающих трудноразрешимые «парадоксы», рассмотрение которых в рамках существующей достаточно ограниченной по часам учебной программы отвлекает много времени от изучения более фундаментальных вопросов.

Разумеется, трудно отрицать значение понятия «нуля» в математике, где на нём строится вся десятичная система исчисления, или в информатике, где двузначная кодировка «единица – ноль», т.е. «плюс – минус», «релейная цепь сомкнута – разомкнута», – служит основой самых разнообразных искусственных языков программирования.

Несколько по-иному, предположительно, обстоит дело в «формальной логике», где появление «нулевых» понятий в значительной